ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ”

Аб’ект аўтарскага права

УДК 394-055.25(476.7-22)(043.3)

**СЕЛЯХ**
**Аксана Аляксандраўна**

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ ПАЎСЯДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКІХ СЕЛЬСКІХ ДЗЯЎЧАТ У ЗАХОДНІМ ПАЛЕССІ Ў 20–80-Я ГГ. ХХ СТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Мінск, 2026

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана на кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Навуковы кіраўнік: **Навагродскі Тадэвуш Антонавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Валодзіна Таццяна Васільеўна,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Чарнякевіч Ірына Сафронаўна,** кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных навук УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»

Апаніруючая арганізацыя: **УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»**

Абарона адбудзецца 25 чэрвеня 2026 года ў 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072 г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, ауд. 302; тэлефон вучонага сакратара: 270-29-24; E-mail: tyapkova-anna@mail.ru.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Аўтарэферат разасланы 21 мая 2026 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Г. І. Цяпкова

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# УВОДЗІНЫ

Вывучэнне культурных пераўтварэнняў займае адно з цэнтральных месцаў у сучаснай беларускай этналогіі. Дынаміка культуры абумоўлена трансфармацыйнымі працэсамі, якія ўяўляюць сабой сістэмныя якасныя змены сацыякультурнай рэальнасці, што адбываюцца паступова. Прасачыць асаблівасці трансфармацыі беларускай традыцыйнай культуры ўяўляецца дарэчным на прыкладзе рэтраспектыўнага разгляду паўсядзённага жыцця грамадства ў лакальнай прасторы, дзе на першы план выходзяць асабістасць падзей, індывідуальнасць ацэнак, унікальнасць досведу. Даследаванне паўсядзённасці з улікам сацыяльнай, гендарнай, узроставай, статуснай, канфесійнай спецыфікі спрыяе разуменню культурных асаблівасцей, прынцыпаў узаемадзеяння асобных груп насельніцтва, а таксама ўнутранай логікі культуры этнасу ў цэлым.

Праблематызацыя трансфармацыі дзявочай паўсядзённасці дазваляе прасачыць дынаміку этнакультурных працэсаў у Заходнім Палессі на працягу даследаванага перыяду ў залежнасці не столькі ад знешніх макразменаў (грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных), колькі ад унутраных трансфармацый дзявочай ідэнтычнасці і ўласна дзявочага этасу. У фокусе дысертацыйнага даследавання паводле этнічнай прыналежнасці знаходзіліся беларускі, гендарнай прыкметы – дзяўчаты, сямейнага статусу – незамужнія, сацыяльнага становішча – сялянкі. Комплекснае вывучэнне трансфармацыі дзявочай паўсядзённасці на працягу 20–80-х гг. ХХ ст. з’яўляецца актуальным, паколькі дае магчымасць выявіць характар змен, якія закранулі асноўныя параметры паўсядзённага жыцця дзяўчат: становішча ў сям’і і соцыуме, культуру дашлюбных адносін, культуру жыццезабеспячэння, узровень рэлігійнасці, а таксама вызначыць ступень пераемнасці і захавання традыцый.

Навуковая значнасць даследавання абгрунтавана тым, што праблема трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх заходнепалескіх дзяўчат у 20–80-я гг. ХХ ст. не з’ўлялася прадметам спецыяльнага этналагічнага даследавання. Фундаментам працы стаў багаты фактычны матэрыял, сабраны аўтарам у выніку асабістых палявых даследаванняў у сельскай мясцовасці Заходняга Палесся, што праводзіліся ў 2015–2023 гг. Антрапалагічная зарыентаванасць працы дала падставу разглядаць дзяўчат у якасці суб’ектаў гісторыі, а іх паўсядзённыя практыкі і жыццёвыя досведы як значныя аспекты мінулага. Рознапланавасць крыніц садзейнічала вывучэнню ўнікальнага культурнага ландшафту Заходняга Палесся ў сістэмным і функцыянальным адзінстве ўсіх яго кампанентаў: мясцовая гаворка, фальклор, светапогляд,

каштоўнасныя арыенціры. Выкарыстанне рэлевантных мэце і задачам даследавання метадалагічных прынцыпаў і падыходаў паспрыяла выяўленню спецыфікі трансфармацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст. з улікам іх гістарычнай і культурнай абумоўленасці.

Матэрыялы дысертацыі даюць уяўленне аб механізме функцыянавання заходнепалескай сялянскай культуры з пункту гледжання полаўзроставай і статуснай стратыфікацый, якія з'яўляліся адным са значных фактараў арганізацыі і дыферэнцыяцыі паўсядзённага жыцця грамадства.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь працы з навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне адпавядае п. 11 “Грамадства і эканоміка” прыярытэтных напрамкаў навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг., зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.03.2015 № 190.

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта* даследавання – выяўленне спецыфікі трансфармацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст.

У адпаведнасці з пастаўленай мэтай вырашаліся наступныя *задачы*:

1) раскрыць сутнасць змен становішча сельскіх дзяўчат у сям'і;

2) прасачыць дынаміку грамадскіх статусных і ролевых пазіцый сельскіх дзяўчат;

3) вызначыць характэрныя рысы трансфармацыі культуры дашлюбных паводзін сельскіх дзяўчат;

4) выявіць асаблівасці культуры жыццезабеспячэння і яе ўплыву на паўсядзённасць сельскіх дзяўчат.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

*Аб'ект* даследавання – заходнепалеская вясковая супольнасць. *Прадмет* даследавання – трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст.

*Геаграфічныя рамкі* даследавання – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Заходняе Палессе. Яго межы ахопліваюць паўднёва-заходнюю частку сучаснай Брэсцкай вобласці, якая супадае з арэаламі заходнепалескіх (брэсцка-пінскіх) гаворак [[1], с. 208], [[2], с. 3–4].

---

[1] Цітоў, В. С. Заходняе Палессе / В. С. Цітоў // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

*Храналагічныя рамкі* даследавання абмяжоўваюцца 20–80-мі гг. XX ст. і звязаныя як з гісторыка-палітычным кантэкстам, так і спецыфікай сацыякультурнага развіцця рэгіёну. Ніжняя мяжа – 20-я гг. XX ст. Гэты перыяд у беларускай гістарычнай навуцы лічыцца пачаткам пэўных мадэрнізацыйных працэсаў, звязаных са стварэннем новай дзяржавы, пошукам шляхоў стабілізацыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, дэмаграфічнага развіцця грамадства пасля Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сацыякультурная абумоўленасць выдзялення перыяду абгрунтавана наступным: ва ўмовах запаволенага эканамічнага развіцця, слабай ўрбанізацыі ў Заходнім Палессі ў міжваенны час (тэрыторыя знаходзілася ў складзе Польшчы), у час Другой сусветнай вайны, склаліся ўмовы для працягу кансервацыі традыцыйнага культурнага ландшафту, "замкнёнасці" сацыяльнай прасторы вяскоўцаў, што ў многім на некалькі дзесяцігоддзяў вызначыла асаблівасці дзявочага паўсядзённага жыцця. Верхняя мяжа даследавання – 80-я гг. XX ст. – завяршальны перыяд існавання СССР, пэўны фінал грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных працэсаў, што адбываліся ў краіне на працягу савецкага перыяду. Для заходнепалескага рэгіёну гэта час заўважнай урбанізацыі вёскі, інтэнсіфікацыі міграцыйных працэсаў, росту адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, ва ўмовах якіх канчаткова разбуралася "замкнёнасць" як фізічнай, так і сацыяльнай прасторы вёскі. Згаданыя фактары стварылі дадатковыя перашкоды ў працэсе пераемнасці і ўзнаўлення ў наступных пакаленнях традыцыйнай культуры заходнепалескай вясковай супольнасці, што ўплывала на трансфармацыю дзявочай паўсядзённасці.

**Навуковая навізна**

Навуковая навізна абумоўлена тым, што спецыяльнае даследаванне трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст. з прымяненнем міждысцыплінарнага падыходу ў айчыннай этналогіі было праведзена ўпершыню. Навізна даследавання заключаецца ў яго антрапалагічнай зарыентаванасці, што было рэалізавана праз выкарыстанне адпаведнага метадалагічнага інструментарыя. Адметнасцю даследчай працы з'яўляецца вывучэнне праблемы на падставе палявых матэрыялаў, сабраных аўтарам, што спрыяла лепшаму разуменню рэгіянальных сацыякультурных асаблівасцяў, а таксама дазволіла прасачыць спецыфіку трансфармацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці заходнепалескіх сельскіх дзяўчат з пункту гледжання непасрэдных удзельнікаў гэтых працэсаў. Упершыню ў беларускай этналогіі быў сістэмна разгледжаны канцэпт

---

[2] Клімчук Ф. Д. Гаворкі Заходняга Палесся: Фанетычны нарыс / Ф. Д. Клімчук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 127 с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

“дзявоцтва”, дадзена вызначэнне паняццяў “дзявочая паўсядзённасць”, “трансфармацыя дзявочай паўсядзённасці”. Аўтарам была раскрыта сутнасць змен становішча сельскіх дзяўчат у сям’і, прааналізавана дынаміка іх грамадскіх статусных і ролевых пазіцый, вызначаны характэрныя рысы трансфармацыі культуры дашлюбных паводзін дзяўчат, выяўлены асаблівасці культуры жыццезабеспячэння і яе ўплыву на дзявочую паўсядзённасць. Дысертантам сістэмна разгледжаны пытанні, што былі недастаткова вывучаныя ў беларускай этналогіі, сярод якіх: фарміраванне рукапіснай культуры сельскіх дзяўчат і культуры дзявоцтва ўвогуле, працоўныя стратэгіі ў паўсядзённым жыцці сельскіх дзяўчат, традыцыі баўлення вольнага часу, уплыў родавых уяўленняў на становішча дзяўчыны ў сельскім соцыуме.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. *Сутнасць змен становішча беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у сям’і ў айчыннай этналогіі разгледжана ўпершыню.* Логіка ўнутрысямейных зносін (з бацькамі і дзядамі, паміж дзецьмі), становішча ў сям’і, выхаваўчыя метады і напрамкі адпавядалі ўзростава-статусным перыядам *дзіця – дзяўчынка – дзяўчына (дзеўка)*. Бацькамі вызначаліся віды і аб’ём працоўнай дзейнасці, значнасць і магчымасць атрымання адукацыі, жыццёвыя прыярытэты. З дзяцінства да юнацтва дачка з’яўлялася аб’ектам выхавання і сацыялізацыі. Пры пэўных гістарычна абумоўленых акалічнасцях – адсутнасць мужчын у сям’і (хвароба бацькі, адсутнасць братоў, сіроцтва) або немагчымасць імі выконваць гаспадарчыя функцыі (адыходніцтва, знаходжанне ў войску) – сямейны статус дзяўчыны значна павышаўся. Тым не менш аўтарытэт бацькоў захоўваўся. *Трансфармацыя* статусу дачкі ў сям’і ў 20–80-я гг. ХХ ст. была звязана з *паступовым паслабленнем* яе падпарадкаванага становішча.

2. *Упершыню ў айчыннай этналогіі надаецца ўвага аналізу дынамікі грамадскіх статусных і ролевых пазіцый беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат.* Становішча дзяўчыны ў сельскім грамадстве на працягу 20–80-х гг. ХХ ст. было падпарадкавана сацыяльнай іерархіі, што існавала ў вёсцы і была заснавана на полаўзроставай і статуснай стратыфікацыі. Сацыяльны статус і ролі дзяўчыны таксама вызначаліся адпаведнасцю яе паводзін традыцыйным нормам. Грамадскі статус дзяўчат быў даволі высокім па прычыне ўскладання на іх пэўных роляў у абрадавым жыцці. *Трансфармацыя* статусных і ролевых пазіцый дзяўчат адбывалася адпаведна *паступоваму паніжэнню* значнасці аскрыптыўных сацыяльных норм у рэгламентацыі адносін і парадку ў вёсцы.

Разгляд статусных пазіцый дзяўчат дазволіў выявіць спецыфіку фарміравання і асаблівасці дзявочай субкультуры ў заходнепалескай вёсцы,

што зроблена ў беларускай этналогіі *ўпершыню*. Сяброўскія групоўкі дзяўчат фарміраваліся ў адпаведнасці са статусна-ўзроставай стратыфікацыяй. Найбольшы аўтарытэт і правы ў сістэме міждзявочых адносін вёскі мела група старэйшых дзяўчат. Вопыт "перажыванняў" дзяўчат, звязаны з палавым сталеннем, актуалізацыяй матрыманіяльнай устаноўкі, знайшоў заўважнае адлюстраванне ў пісьмовых формах фальклору (спеўнікі, сшыткі пажаданняў, анкеты, дзённікі, соннікі і інш.), якія былі неад'емнай часткай дзявочай паўсядзённасці ў 1970–1980-я гг.

3. *Упершыню ў айчыннай этналогіі разгледжаны асаблівасці трансфармацыі культуры дашлюбных паводзін беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат.* На асаблівасці дашлюбнага жыцця дзяўчат у перыяд 20–80-х гг. XX ст. аказвалі ўздзеянне нормы традыцыйнай культуры, сярод якіх асноўнымі былі захаванне цноты, асуджэнне абортаў, арыентацыя на замужжа і дзетанараджэнне. Трываласць хрысціянскай светапогляднай мадэлі садзейнічала кансервацыі традыцый у культуры дашлюбных міжпалавых адносін, але сацыяльна-эканамічныя і культурныя працэсы другой паловы 40–80-х гг. XX ст., што адбываліся ў рэгіёне, – наступствы вайны, узрастанне тэрытарыяльнай мабільнасці, урбанізацыя, дэтабуізацыя інтымнай сферы жыцця – выклікалі *змены* ў палавой маралі сельскіх дзяўчат, у адпаведнасці з якой складваліся традыцыі дашлюбных паводзін, вызначаліся формы і змест баўлення часу.

Традыцыі баўлення часу заходнепалескімі сельскімі дзяўчатамі сістэмна разгледжаны *ўпершыню.* Формы і змест баўлення часу ў значнай ступені вызначаліся сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі працэсамі, што адбываліся ў вёсцы, а таксама канфесійнай прыналежнасцю дзяўчат. На працягу разгледжанага перыяду ў заходнепалескай вёсцы існаваў цэлы комплекс тыпалагічна варыятыўных пераважна вечаровых мерапрыемстваў (вячоркі і танцы па хатах, школьныя вечары, клубныя танцы, зборы ў моладзевых "месцах сустрэч" і інш.). Працоўная або працоўна-забаўляльная накіраванаць вячорак *паступова замянялася* выключна забаўляльнай, што найбольш пачало праяўляцца ў 70–80-я гг. XX ст.

4. *Асаблівасці культуры жыццезабеспячэння і яе ўплыву на паўсядзённасць беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у айчыннай этналогіі разглядаюцца ўпершыню.* Жыццезабеспячэнне (харчаванне, адзенне) з'яўлялася актуальнай праблемай для многіх дзяўчат, дзеля вырашэння якой выкарыстоўваліся працоўныя стратэгіі. Найбольш пашыранымі формамі дзявочых працоўных пазахатніх практык у перыяд 20–40-х гг. XX ст. былі наём і "прымацтва", у 50–80-я гг. XX ст. – праца "па сезонах", "заробкі". Стратэгіі жыццезабеспячэння былі неад'емнай часткай дзявочай паўсядзённасці, якія

прадвызначалі яе. Магчымасць эканамічнага самазабеспячэння выклікала *змены* сацыяльнага становішча дзяўчат у вёсцы. Тэрытарыяльная мабільнасць садзейнічала актывізацыі міжкультурнай камунікацыі, што суправаджалася пераймannем дзяўчатамі ўзораў гарадской культуры і *паступовым адыходам* ад традыцыйных каштоўнасцей і норм заходнепалескага соцыуму.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з’яўляецца самастойным даследаваннем, выкананым на падставе разнастайных крыніц. Аўтарам прааналізаваны і ўведзены ў навуковы зварот матэрыялы асабістых палявых даследаванняў (успаміны, а таксама сабраныя з прыватных архіваў рэспандэнтаў фотаздымкі, выяўленчыя матэрыялы, матэрыялы дзявочага пісьмовага фальклору). У даследаванні выкарыстаны не апублікаваныя раней матэрыялы са студэнцкіх практык, дзяржаўных архіваў, архіваў навуковых устаноў.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Матэрыялы і высновы дысертацыйнага даследавання былі ўкаранёны ў навучальны працэс гістарычнага факультэта УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна” пры чытанні лекцыйных курсаў па дысцыплінах “Этналогія Беларусі”, “Матэрыяльная культура і побыт Беларусі”, “Гісторыя штодзённасці”, “Культуралогія”, “Сацыякультурная антрапалогія”. Палявы інструментарый выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы і правядзенні студэнцкай вучэбнай гісторыка-краязнаўчай і археолага-этнаграфічнай практыкі (акт укаранення ад 27.11.2023). Матэрыялы даследавання ўкаранёны ў працу ДУ “Музей Беларускага Палесся” (акт укаранення ад 28.11.2023). Матэрыялы даследавання ўкаранёны ў адукацыйны працэс ДУА “Батчынская сярэдняя школа” (акт укаранення ад 27.12.2022).

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі апрабаваныя на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях рознага ўзроўню: Міжнародная канферэнцыя “Wspólne dziedzictwo kulturowe. Dialog kultury z naturą” (Беласток, 2015), Міжнародны форум “Першы крок у навуку – 2016” (Мінск, 2016), Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя маладых вучоных (Брэст, 2016), Міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава” (Гродна, 2019), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Этнакультурная спадчына Беларусі ў XXI стагоддзі” (Мінск, 2021), Міжнародная навуковая канферэнцыя “Традиции и современное состояние культуры и искусств” (Мінск, 2021), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Образование: Опыт. Инновации. Перспективы” (Мінск, 2022), Рэспубліканская навуковая канферэнцыя “Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы” (Гомель, 2021, 2023,

2025), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі “ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы” (Мінск, 2019, 2022, 2024), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Актуальные направления исследований современной антропологии” (Мінск, 2022), Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Историческая наука: достижения проблемы, перспективы” (Брэст, 2021, 2022, 2023), Рэспубліканская навуковая канферэнцыя маладых даследчыкаў “Культурная спадчына і гістарычная памяць” (Брэст, 2024, 2025); Форум Саюзнай дзяржавы “Роль молодежи в сохранении и защите исторической памяти” (Магілёў, 2025), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Западная Беларусь 1921–1939 гг. в пространстве и времени: к 100-летию Белорусской крестьянско-рабочей Громады и дню Народного единства” (Брэст, 2025); Рэспубліканская навуковая канфеэнцыя “Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, папулярызацыя” (Брэст, 2025).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 36 навуковых работах, з іх 8 – артыкулы, уключаныя ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 9 – артыкулы ў зборніках навуковых работ, 17 – артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 2 – тэзісы. Аб’ём артыкулаў у выданнях, уключаных ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, складае 5,8 друк. арк. Агульны аб’ём публікацый – 12,5 друк. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, 4 глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў. Агульны аб’ём працы – 178 старонак, з іх – 122 займае асноўны тэкст. Бібліяграфічны спіс утрымлівае 297 пазіцый. Дадаткі займаюць 25 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Глава 1 «Аналітычны агляд літаратуры. Крыніцы і метады даследавання»** складаецца з трох параграфаў. У **параграфе 1.1 «Аналітычны агляд літаратуры»** разгледжана гістарыяграфія праблемы. Храналогія гістарыяграфіі пытання – другая палова XIX – 2020-я гг. На працягу разглядаемага перыяду дзявочая паўсядзённасць (асобныя яе аспекты)

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІЦЫ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў выданнях, уключаных у Пералік ВАК Рэспублікі Беларусь

1. Гугнюк (Селях), А. А. Вывучэнне дзявочай штодзённасці ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі / А. А. Гугнюк (Селях) // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2021. – Вып. 30. – С. 215–220.

2. Гугнюк (Селях), А. А. Убранне заходнепалескай вясковай дзяўчыны ў 1920–1980-я гг.: традыцыі і трансфармацыі / А. А. Гугнюк (Селях) // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2022. – Вып. 31. – С. 291–301.

3. Селях, А. А. Штодзённае жыццё сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся ў 20-я–80-я гг. ХХ ст. як даследчая праблема / А. А. Селях // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2022. – № 2. – С. 24–32.

4. Селях, А. А. Баўленне вольнага часу заходнепалескай моладдзю ў 2-й палове 1940-х–1980-я гг. / А. А. Селях // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2023. – Вып. 34. – С. 557–567.

5. Селях, А. А. Асаблівасці дашлюбнага жыцця заходнепалескіх сельскіх дзяўчат: традыцыі і трансфармацыі (па матэрыялам вуснай гісторыі) / А. А. Селях // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Серия A. Гуманитарные науки. – 2023. – № 2(67). – С. 114–118.

6. Селях, А. А. Антрапалогія дзявоцтва: заходнепалеская народная традыцыя / А. А. Селях // Актуальные вопросы антропологии : сб. науч. тр. / НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2023. – Вып. 18. – С. 119–130.

7. Селях, А. Дзявочая рукапісная культура другой паловы ХХ ст.: па матэрыялах з Заходняга Палесся / А. Селях // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. пр. – Мінск : Беларус. навука, 2024. – Вып. 11. – С. 248–261.

8. Селях, А. «А чыя ты будзеш?»: канцэпт роду дзяўчыны ў карціне свету заходнепалескіх сялян / А. Селях // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. пр. – Мінск : Беларус. навука, 2025. – Вып. 12. – С. 145–168.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Артыкулы ў зборніках навуковых прац**

9. Гугнюк (Селях), А. А. Праблема штодзённасці і антрапалогія дзявоцтва ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі / А. А. Гугнюк (Селях) // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт., прысвеч. 80-год. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы і 65-год. гіст. адукацыі ў Гродзен. дзярж. ун-це імя Янкі Купалы. У 2 ч. / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2019. – Ч. 1. – С. 128–130.

10. Гугнюк (Селях), А. А. Дзяўчына перадшлюбнага ўзросту ў традыцыйным сельскім соцыуме: становішча, успрыманне, статус / А. А. Гугнюк (Селях), В. Ю. Пініповіч // Сборник научных работ студентов Республики Беларусь «НИРС 2018» / редкол. : И. А. Старовойтова (пред.) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2019. – С.607–610.

11. Гугнюк (Селях), А. А. «Маладая» у традыцыйных народных уяўленнях: семантыка, статус, сімволіка (з успамінаў жыхароў Заходняга Палесся) / А. А. Гугнюк (Селях) // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. / гал. рэд. А. І. Лакотка ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2023. – Вып. 4. – С. 489–495.

12. Селях, А. А. Удзел дзяўчат у абрадавым жыцці заходнепалескай вёскі ў ХІХ – першай палове ХХ ст. / А. А. Селях // Моладзь Берасцейшчыны : зб. навук. прац. малад. даследч. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: А. М. Вабішчэвіч [і інш.]. – Брэст : “Альтернатива”, 2023. – Вып. 11. – С. 32–39.

13. Селях, А. А. Полаўзроставы дыскурс у сучасных беларускіх этналагічных даследаваннях / А. А. Селях // З гісторыі навукі ў Беларусі (да 100-годдзя Інстытута беларускай культуры) : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: І. І. Шаўчук (адказ. рэд.), А. І. Пашковіч. – Брэст : БрДУ, 2023. – С. 145–150.

14. Селях, А. А. Месца пісьмовага фальклору ў дзявочай культуры заходнепалескай вёскі другой паловы ХХ ст. / А. А. Селях // «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы» : зб. навук. арт. / Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ; рэдкал. Т. Даўгач [і інш.]. – Мінск : «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2024. – С. 364–369.

15. Селях, А. А. Адукацыя ў штодзённым жыцці заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі / А. А. Селях // Моладзь Берасцейшчыны : зб. навук. прац малад. даследч. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: А. А. Савіч [і інш.]. – Брэст : “Альтернатива”, 2025. – Вып. 12. – С. 32–37.

16. Селях, А. А. "На доўгую памяць": паэтычныя інскрыпты ў рукапіснай дзявочай культуры апошняй трэці XX ст. (на матэрыялах з Заходняга Палесся) / А. А. Селях // Гісторыка-культурная спадчына Беларусі: вывучэнне, захаванне, папулярызацыя : зб. навук. артыкул. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; уклад.: А. А. Башкоў, В. Ю. Піліповіч. – Брэст : БрДУ, 2025. – С. 95–99.

17. Селях, А. А. Становішча дачкі ў традыцыйнай сялянскай сям'і (па матэрыялах з Заходняга Палесся) / А. А. Селях // «Заходняя Беларусь (1921–1939) – гісторыя, культура, літаратурны рух : зб. навук. арт., прысвеч. 85-годдзю з дня аб'яднання Беларусі і Дню народнага адзінства / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Я. Купалы ; рэдкал.: Т. П. Барысюк [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2026. – С. 139–147.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

18. Гугнюк (Селях), О. А. Гендерная этнография: актуальные проблемы исследования / О. А. Гугнюк (Селях) // Беларусь и славянский мир в интеллектуальном контексте времени : сборник материалов науч.-практ. конф., Брест, 21 мая 2015 г. : Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина ; редкол.: Л. М. Калилец [и др.]. – Брест : БрГУ, 2015. – С. 24–26.

19. Гугнюк (Селях), О. «Деревенские вечёрки»: традиции гендерного общения сельской молодежи в середине XX в. (на полевых материалах Брестского Полесья) / О. Гугнюк (Селях) // Wspólne dziedzictwo kulturowe. Dialog kultury z naturą / red. Magdalena Winograd. – Białystok : Uniwersytet w Białymstoku, 2016. – С. 430–440.

20. Гугнюк (Селях), О. А. Вечёрочные мероприятия в культуре повседневности села в 20–40 гг. XX в. (на примере Малоритчины) / О. А. Гугнюк (Селях) // XVIII Республиканская научно-методическая конференция молодых ученых: сборник материалов, Брест, 13 мая 2016 г. : в 2 ч. / гл. ред. А. Е. Будько. – Брест : БрГУ имени А. С. Пушкина, 2016. – Ч. 1. – С. 101–102.

21. Гугнюк (Селях), О. А. К вопросу о названиях досуговых мероприятий сельской молодёжи на Брестчине (30–50 гг. XX в.): опыт исследования / О. А. Гугнюк (Селях) // Первый шаг в науку – 2016 : сборник материалов Международного форума, Минск, 4–5 нояб. 2016 г. : в 2 ч. / гл. ред. Ю. М. Сафонова [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2016. – Ч. 1. – С. 191–193.

22. Гугнюк (Селях), О. А. Девушка в сельском социуме 30–50 гг. XX в.: традиции воспитания / О. А. Гугнюк (Селях) // Беларусь и славянский мир в

интеллектуальном контексте времени : сб. материалов науч.-практ. конф., Брест, 15 марта 2018 г. / Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина ; редкол. Л. М. Калилец [и др.]. – Брест : БрГУ имени А. С. Пушкина, 2018. – С. 51–54.

23. Гугнюк (Селях), О. А. Повседневная жизнь сельских девушек в работах белорусских этнографов (1990–2010-е гг.) / О. А. Гугнюк (Селях) // Беларусь и славянский мир в интеллектуальном контексте времени : сборник материалов науч.-практ. конф., Брест, 14 марта 2019 г. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; редкол.: Л. М. Калилец, Н. В. Самосюк. – Брест : БрГУ, 2019. – С. 69–71.

24. Гугнюк (Селях), О. А. Oral History as a Method of Research / О. А. Гугнюк (Селях), Д. В. Уснарский // Иностранные языки и современный мир : сб. материалов междунар. науч. конф. студентов, Брест, 5 апр. 2019 г. / Брест. гос. ун-т. имени А.С. Пушкина ; редкол.: Л. М. Максимук [и др.]. – Брест : БрГУ, 2019. – С. 66–68.

25. Гугнюк (Селях), А. А. Асаблівасці гендэрнай сацыялізацыі дзяўчат у традыцыйнай заходнепалескай вёсцы / А. А. Гугнюк (Селях) // Историческая наука: достижения, проблемы, перспективы : электрон. сб. материалов XIII Респ. науч.-практ. конф. студентов, магистрантов и молодых ученых, Брест, 23 апр. 2021 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол. Е. А. Бурик [и др.]. – Брест : БрГУ, 2021. – С. 27–30. – URL: https://rep.brsu.by/handle/123456789/7463 (дата звароту: 08.02.2026).

26. Гугнюк (Селях), А. А. Побыт “жаночага дзяцінства” у традыцыйнай заходнепалескай вёсцы / А. А. Гугнюк (Селях) // Этнокультурное наследие Беларуси в XXI веке : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 18 июня 2021 г. / редкол.: Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. − Минск, 2021. – С. 35–40.

27. Гугнюк (Селях), А. А. Жаночая фізіялогія ў традыцыйных уяўленнях беларусаў (на прыкладзе заходнепалескай вёскі) / А. А. Гугнюк (Селях) // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Гомель, 14 кастр. 2021 г. / рэдкал.: А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – С. 64–68.

28. Гугнюк (Селях), А. А. Успаміны заходнепалескіх жанчын аб традыцыйнай народнай касметыцы / А. А. Гугнюк (Селях) // Развитие белорусской государственности: истоки, становление, перспективы : материалы республик. науч. конф. молодых ученых, 18 марта 2021 г., и 78-й науч. конф. студентов и аспирантов БГУ, 13 мая 2021 г. : сборник научных работ студентов

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

и аспирантов исторического факультета БГУ / редкол.: А. Г. Кохановский (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2022. – С 19–23.

29. Селях, А. А. Адукацыя заходнепалескіх сельскіх дзяўчат ў міжваенны перыяд (1921–1939 гг.) / А. А. Селях // Международный вестник науки и образования : электрон. сб. научных статей и исследований междунар. науч.-практ. конф., Минск, 20 мая 2022 г. – Минск : Международный институт науки и инноваций, 2022. – С. 198–200. – URL: https://iisi.science/vestnik3.pdf (дата звароту: 08.02.2026).

30. Селях, А. А. Фотаздымак як крыніца па вывучэнню гісторыі дзявочай штодзённасці / А. А. Селях // Историческая наука: достижения, проблемы, перспективы : электрон. сб. материалов XIV Респ. науч.-практ. конф. студентов, магистрантов и молодых ученых, Брест, 15 апр. 2022 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол. Е. И. Пашкович [и др.]. – Брест : БрГУ, 2023. – С. 22–26. – URL: http://rep.brsu.by:80/handle/123456789/7959 (дата звароту: 08.02.2026).

31. Селях, А. А. Дзяўчына ў сацыяльнай структуры заходнепалескай традыцыйнай вёскі / А. А. Селях // 79-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета : материалы конф., Минск, 10–21 мая 2022 г. В 3 ч. / Белорус. гос.ун-т ; редкол. : В. Г. Сафонов (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2023. – Ч. 3. – С. 193–196. – URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/295080 (дата звароту: 08.02.2026).

32. Селях, А. А. Камунікатыўныя практыкі заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у другой палове XX стагоддзя / А. А. Селях // Историческая наука: достижения, проблемы, перспективы : электрон. сб. материалов XV Респ. науч.-практ. конф. студентов, магистрантов и молодых ученых, Брест, 21 апр. 2023 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол. Е. И. Пашкович [и др.]. – Брест : БрГУ, 2023. – С. 21–25. – URL: http://rep.brsu.by:80/handle/123456789/10222 (дата звароту: 08.02.2026).

33. Селях, А. А. Моладзь і сельская грамада: спецыфіка дачыненняў у другой палове XX стагоддзя (на прыкладзе заходнепалескай вёскі) / А. А Селях // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Гомель, 26 кастр. 2023 г. / М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2023. – С. 155–160.

34. Селях, А. А. Адаптацыя заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у сацыякультурнай прасторы горада (у другой палове XX ст.): да пастаноўкі пытання / А. А. Селях // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы

Рэсп. навук. канф., Гомель, 16–17 кастр. 2025 г. / М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2025. – С. 56–58. – URL: http://conference.gsu.by (дата звароту: 08.02.2026).

**Тэзісы выступленняў на навуковых канферэнцыях**

35. Гугнюк (Селях), О. А. Сельские девочки и девушки Брестчины в 1930–1950-е гг.: особенности материальной культуры детства и девичества / О. А. Гугнюк (Селях) // II конференция молодых исследователей Института истории НАН Беларуси «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы», посвященная 90-летию Института истории Беларуси : сборник тезисов, Минск, 4–5 апреля 2019 г. / Институт истории Национальной академии наук Беларуси; редкол. А. Трубчик [и др.]. – Минск : «Белорусская наука», 2019. – С. 19–20.

36. Селях, А. А. Пазахатнія працоўныя практыкі заходнепалескай дзяўчыны ў 1920–1960 гг. / А. А. Селях // V міжнародная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы» : зборнік тэзісаў і дакладаў, Мінск, 21–22 красавіка 2022 г. / Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ; рэдкал.: Т. Даўгач [і інш.]. – Мінск : «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2022. – С. 115–119.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЭЗЮМЭ

**Селях Аксана Аляксандраўна**

## Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.

**Ключавыя словы:** трансфармацыя, дзявочая паўсядзённасць, сельскія дзяўчаты-беларускі, вясковая супольнасць, Заходняе Палессе.

**Мэта даследавання:** выяўленне спецыфікі трансфармацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.

**Метады даследавання:** у працы былі выкарыстаны традыцыйныя для этналагічнай навукі метады апытання (паўфармалізаванае і нефармалізаванае інтэрв'ю) і назірання, метады гістарычнай навукі (параўнальна-гістарычны, гістарычнай рэканструкцыі, структурна-функцыянальны).

**Навуковая навізна вынікаў даследавання:** упершыню ў айчыннай этналогіі было праведзена спецыяльнае даследаванне трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст. Адметнасцю даследчай працы з'яўляецца вывучэнне праблемы на падставе асабістых палявых матэрыялаў аўтара. Упершыню сістэмна быў разгледжаны канцэпт "дзявоцтва", дадзена вызначэнне паняццяў "дзявочая паўсядзённасць", "трансфармацыя дзявочай паўсядзённасці". Раскрыта сутнасць змен становішча сельскіх дзяўчат у сям'і, прааналізавана дынаміка іх грамадскіх статусных і ролевых пазіцый, вызначаны характэрныя рысы трансфармацыі культуры дашлюбных паводзін дзяўчат, выяўлены асаблівасці культуры жыццезабеспячэння і яе ўплыву на дзявочую паўсядзённасць.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні:** матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, агульных лекцыйных і спецыяльных курсаў для вышэйшых навучальных устаноў. Распрацаваны апытальны ліст можа быць карысным у якасці дапаможнага матэрыялу для арганізацыі палявой працы студэнтаў падчас археолага-этнаграфічнай і гісторыка-краязнаўчай навучальных практык.

**Галіна выкарыстання:** этналогія, гісторыя, культурная антрапалогія, культуралогія, этнапсіхалогія, этнапедагогіка.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЕЗЮМЕ


**Селях Оксана Александровна**

**Трансформация повседневной жизни белорусских сельских девушек в Западном Полесье в 20–80-е гг. XX в.**

**Ключевые слова:** трансформация, девичья повседневность, сельские девушки-белоруски, деревенское общество, Западное Полесье.

**Цель исследования:** выявление специфики трансформационных процессов в повседневной жизни белорусских сельских девушек в Западном Полесье в 20–80-е гг. XX в.

**Методы исследования:** в работе были использованы традиционные для этнологической науки методы опроса (полуформализованное и неформализованное интервью) и наблюдения, методы исторической науки (сравнительно-исторический, исторической реконструкции, структурно-функциональный).

**Научная новизна результатов исследования:** впервые в отечественной этнологии было проведено специальное исследование трансформации повседневной жизни белорусских сельских девушек в Западном Полесье в 20–80-е гг. XX в. Особенностью исследовательской работы является изучение проблемы на основании личных полевых материалов автора. Впервые был системно рассмотрен концепт “девичество”, дано определение понятий “девичья повседневность”, “трансформация девичьей повседневности”. Раскрыта сущность изменений положения сельских девушек в семье, проанализирована динамика их общественных статусных и ролевых позиций, определены характерные черты трансформации культуры добрачного поведения девушек, выявлены особенности культуры жизнеобеспечения и ее влияния на девичью повседневность.

**Рекомендации по практическому использованию:** материалы и результаты диссертационного исследования могут быть использованы для подготовки учебников, учебных пособий, общих лекционных и специальных курсов для высших учебных заведений. Разработанный опросный лист может быть полезным в качестве вспомогательного материала для организации полевой работы студентов во время археолого-этнографической и историко-краеведческой учебных практик.

**Область применения:** этнология, история, культурная антропология, культурология, этнопедагогика, этнопсихология.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY


**Selyakh Aksana Alyaksandrauna**

**Transformation of everyday life of Belarusian rural girls in Western Polesie in the 1920s-1980s.**

**Key words:** transformation, everyday life of girls, rural Belarusian girls, village society, the Western Polesie.

**Purpose of research:** identification of the specifics of transformational processes in the daily life of Belarusian rural girls in the Western Polesie in the 1920s–1980s.

**Methods of research:** traditional methods of ethnological science (semi-formalized and non-formalized interview) and observation, methods of historical science (comparative historical, historical reconstruction, structural and functional).

**Scientific novelty of the research results:** for the first time in Belarusian ethnology a special study was conducted on the transformation of the daily life of rural girls in Western Polesie in the 1920s–1980s. The main conclusions of the research work are based on the personal field materials of the author. This is the peculiarity of the work. The concept of “girlhood” was systematically considered, the definition of the concepts of “girlish everyday life”, “transformation of girlish daily life” was given for the first time. The author revealed the essence of changes in the position of the girls in the family, analyzed the dynamics of their social status and role positions, identified the characteristic features of the transformation of the premarital behavior of the girls, identified the features of the culture of life support and its impact on the daily life of the girls.

**Recommendations for practical use:** the materials and results of the dissertation research can be used to prepare textbooks, teaching aids, general lecture and special courses for higher educational institutions. The questionnaire, which has been developed, can be useful as an auxiliary material for organizing the field work of students during archaeological and ethnographic and also local history training practices.

**Application field:** ethnology, history, cultural anthropology, culturology, ethnopedagogy, ethnopsychology.




ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Отпечатано в РУП "Издательский дом "Белорусская наука"
Заказ 109. Тираж 60 экз.